**“Матуля – дарагое сэрцу слова”: сцэнарый свята ў сярэдняй групе (4 – 5 гадоў)**

**Матуля – гэта непаўторная і незаменная крыніца любові, клопату і падтрымкі. Прадстаўлены сцэнарый свята прапануецца музычным кіраўнікам і выхавацелям дашкольнай адукацыі для падрыхтоўкі дзяцей да святочнага віншавання матуль з Днём жанчын.**

Святлана Іванаўна Райбе,
музычны кіраўнік
вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі
дзіцячага сада №4 Смаргоні

**“Матуля – дарагое сэрцу слова”: сцэнарый свята ў сярэдняй групе (4 – 5 гадоў)**

**Мэта:** стварэнне эмацыянальнага настрою і выхаванне любові, павагі да маці, жанчыны.

**Задачы:** удасканальваць здольнасці, уменні, навыкі дзяцей у розных відах музычнай дзейнасці, замацаваць веды пра вясновую пару года, пра яе асаблівасці, узбагаціць веды пра агульнарэспубліканскае свята Дзень жанчын.

**Матэрыял і абсталяванне:** касцюм на дарослага (Робат Вілі), дзіцячая лейка, дзіцячы пылесос, бутафорская клумба; чатыры пілоткі, чатыры цацкі “самалёт”для песні-танца; чатыры карзінкі, пакеты ад цукра, солі, макарон, шакалада, сока для гульні “ Перанясі маміны пакупкі”; шырма з кветачкамі без сярэдзінкі на палатне для гульні “Пазнай сваё дзіця па далоні”; шумавыя музычныя інструменты па колькасці дзяцей для аркестра, аудыязапісы.

**Папярэдняя работа:** развучванне вершаў, песень, танцаў.

## Ход свята

*Дзеці пад вясёлую музыку забягаюць у музычны зал.*

**Вядучы.** У зале мамы, бабулі, таты – яны прыйшлі да сваіх дзетак, каб разам адзначыць сонечнае веснавое свята 8 Сакавіка! Вось чаму хлопчыкі і дзяўчынкі ў добрым настроі, шчасліва ўсміхаюцца дарагім гасцям.

*Дзеці чытаюць вершы.*

**1-е дзіця.**

Ціха абуджаюцца
Росныя палі,

NG PRESS ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

Веснавая раніца
Крочыць па зямлі… *(А. Дзеружынскі)*
**2-е дзіця.**
Уцякай, мароз-дзядуля,
Чуеш ты, стары, ці не?
На пагорках – булі-гулі –
Песні чуюцца вясне.
**3-е дзіця.**
Маладая вясна,
Залатая пара!
Будзь красна і ясна,
Не шкадуй нам дабра!
**4-е дзіця.**
Вокам маткі зірні,
Бледнасць з твару згані!
Дай уздужаць малым
Пад павеем тваім
Мы вяночак спляцём
Табе песню спяём. *(Я. Колас)*
**Песня "Як вясна прыйшла ў гаі" (***сл. М. Танка, муз. В. Сярых)*
**5-е дзіця.**
Мы сабраліся сёння ў зале,
Каб жартаваць, пець, танцаваць,
Мы дарагіх гасцей сабралі,
Каб матуль нашых павіншаваць.
**6-е дзіця.**
А чаму ж так сёння сонца ярка свеціць?
**7-е дзіця.**
А таму, што нашы мамы – лепшыя на свеце.
**8-е дзіця.**
А таму, што свята мамы – самы лепшы дзень,
А таму, што свята мамы – свята ўсіх людзей.
**9-е дзіця.**
Больш, чым сонейка не небе,
Дзецям мамачка патрэбна,
Бо яна так дзетак любіць

ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ
ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

Іх выхоўвае, галубіць. *(А. Андрэева)*

**10-е дзіця.**

Склалі песенку мы самі,
Наша песенка пра маму…
Мама гляне нам у вочы –
Адгадае, што мы хочам. *(І. Муравейка)*

**Песня “Самая лепшая” (***сл. У. Карызны, муз. А. Рэмізоўскай)*

**Вядучы.** Мама… Гэта слова ў дзіцяці гучыць з самага ранняга ўзросту і застаецца самым дарагім на ўсё жыццё. І дзеткі робяць усё магчымае, каб дапамагаць сваёй матулі. Вось паслухайце.

**11-е дзіця.**

Я чакаю маму,
Вечарам з работы,
Кветачку зрабіла,
Вычысціла боты.

**12-е дзіця.**

А сястрыца Маша,
Казку расказала.
Накарміла кашай,
Каб спакойна спаў я.

**13-е дзіця.**

Толькі мама прыйдзе
І расчыніць дзверы,
Я скажу “Гатова”
Для цябе вячэра!

**Песня “ Маміна памочніца”** *(муз. А. Рэмізоўскай)*

**Вядучая.** Так, дзяўчынкі, сапраўды, матуліны памочніцы, але хлопчыкі таксама жадаюць паказаць, якія яны кемлівыя, і для матулі нават могуць зорачку дастаць.

**Песня-танец “Я хачу пілотам стаць”** *(сл. і муз. С. Ранда "Я хачу пілотам стаць")*

“Я хачу пілотам стаць” *(у перакладзе аўтара сцэнарыя)*

Самалёцік гучна загудзеў
І у неба хутка паляцеў.
Я хачу пілотам стаць
Самалётам кіраваць,

ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

Каб для мамы з неба зорачку дастаць.

Моцна буду я штурвал трымаць
Хутка над падворкамі лятаць.
Я хачу пілотам стаць,
Самалётам кіраваць,
Каб для мамы з неба зорачку дастаць.

**Вядучы.** А зараз, дзеці, мы паглядзім, якія вы на самай справе памочнікі.

**Гульня "Перанясі маміны пакупкі"**

На сталах ляжаць разнастайныя "пакупкі" *(упакоўкі ад прадуктаў)*. Чатыры матулі сядзяць з карзінкамі, дзеці па чарзе ідуць да сталоў, бяруць па адным прадмеце, вяртаюцца да мам, перакладаюць прадмет маме ў карзінку. Ідуць за наступным прадметам і так далей, пакуль не перанясуць усе пакупкі са стала. Перамагае той, хто хутчэй перанясе пакупкі маме. (*Гульня можа быць каманднай.)*

**Вядучы.** Дзеці, а вы любіце казкі?

**Дзеці.** Так!

**Вядучы.** А незвычайныя гісторыі?

**Дзеці.** Так!

**Вядучы.** У адной сям'і дарослыя на некаторы час пакінулі хлопчыка… Адыходзячы наказалі яму прыбраць цацкі, памыць посуд, паставіць на паліцу кніжкі з казкамі. Каб не рабіць усё гэта, хлопчык вырашыў стварыць робата.

*Пад музыку выходзіць робат.*

**Вядучы.**

Вось дзівосы так, дзівосы?! Як жа яго ўключыць? Зараз я паспрабую. *Націскае на кнопку.*

**Робат.** Добрый, дзень!

**Усе.** Добрый дзень!

**Вядучы.** Давайце дзеці спытаем робата, як жа яго зваць?

**Усе.** Як тваё імя?

**Робат**. Я робат Вілі.

**Вядучы.** А што ты ўмееш рабіць?

**Робат.** Я магу ўсё.

**Вядучы.** У жанчын шмат спраў: прыбрацца, кветкі паліць, дзеткам казкі пачытаць.

NG ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

*Гучыць музыка, робат пачынае рабіць усё наадварот. Бярэ лейку і палівае дзетак, пыласосам пыласосіць кветкі.*

**Вядучы.** Трэба хутчэй яго адключыць. Вілі, ты ўсё пераблытаў, не дзетак трэба паліваць, а кветачкі. Пыласосіць трэба дываны. Адкажы, калі ласка, а ці можаш ты казку дзецям пачытаць?

**Робат.** Казку? Добра. Пайду, вазьму казку. (*Адыходзіць і прыгаворвае.)* Пачытаць казку… Пачытаць казку.

**Вядучы.** Я думаю нашы дзеткі самі могуць так усё рабіць, бо яны сапраўдныя памочнікі. А цяпер адгадайце загадку.

Ад калыскі
І на век
Самы блізкі
Чалавек.
З дзедам жыве,
Добрая вельмі
Так сама.
Хто яна вам?

**Дзеці.** Бабуля.

**14-е дзіця.**

Прытуліцца, вясёлая,
Сівенькай галавой,
А вочы – васільковыя,
Нібыта ў маладой.

**15-е дзіця.**

Ласкавая, лагодная,
Руплівая яна,
І без яе ніводнага
Я не ўяўляю дня. *(М. Пазнякоў)*

**16-е дзіця.**

Бабуля дорыць радасць і спакой
Яе клопат ахінае нас с табой.
За ўсё мы ўдзячны, бабуля, табе,
Вясёлай будзь, не скарайся журбе! *(А. Маршалак, перапацавана.)*

**Вядучы.** Мы бабулям хочым падараваць музычны нумар.

**Песня “ Цік-так ходзікі”** *(сл. Л. Панчанка, муз. Э. Ханка).*

**Вядучы.** Свята наша працягнуць дзеткі вершамі, прысвечанымі матулям.

NG ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

**17-е дзіця.**

Мая мама добрая такая,
Мая мама проста залатая!
А ўжо так мяне матулька любіць!
Кожны раз і песціць, і галубіць.

**18-е дзіця.**

І да сэрца горне і мілуе,
І так шчыра-моцна пацалуе,
І прамовіць ласкавае слоўца,
І сама засвеціца – як сонца! *(Н. Гілевіч)*

**Вядучы.** Напэўна, кожная матуля пазнае сваё дзіця не толькі па яго голасе і кроках, і таму для вас, матулі, гульня.

**Гульня "Пазнай сваё дзіця па далоні"**

*Ставіцца шырма, на палатне намаляваны кветачкі, у якіх сярэдзінка выразана. Некалькі дзяцей становяцца за шырму, высоўваюць далонькі, а матуля павінна адгадаць, дзе яе дзіця.*

**Вядучы.** А зараз, паважаныя матулі, прыміце музычнае віншаванне ад вашых дзетак.

**Аркестр "А у нас, як у вас"**

**Вядучая.** А зараз дзеці прачытаюць вам вершы.

**19-е дзіця.**

Снягі ўжо таюць за акном.
Звіняць руч'і, як стрункі,
Мы цэлы тыдзень дзень за днём
Рыхтуем падарункі.

**20-е дзіця.**

Хусцінкі з шоўкавай каймой
Мы вышывалі самі,
Нясу я падарунак свой
Любімай нашай маме.

**21-е дзіця.**

Мы павіншуем не адны
Матулю дарагую.
А з намі ведае яна
Краіна ўся віншуе.

**Песня "Слава маміным рукам"** *(сл. М. Пазнякова, муз. А. Чыркуна)*

NG ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

*Пад музыку заходзіць Робат Вілі.*

**Робат Вілі.** Я прынёс вам казку,  пачытаю  і гэта будзе падарунак.

**Вядучая.** Робат Вілі, ты зноў усё пераблытаў. Кніжка з казкамі – цудоўны падарунак, але ж яна адна, а дзетак паглядзі колькі. Яны жадаюць матуль павіншаваць з Днём жанчын, таму патрэбны для ўсіх дзетак падарункі.

**Робат Вілі.** Я зразумеў. Задайце праграму "Падарункі".

*Вядучая падыходзіць да робата, як быццам задае праграму (гукі "набіраюцца кнопкі"), робат ідзе, бярэ паштоўкі, якія дзеці загадзя падрыхтавалі для сваіх матуль. Спачатку дзяўчынкі, а потым хлопчыкі бяруць паштоўкі і дораць сваім матулям.*

**Вядучы.**

Яшчэ раз віншуем  вас, дарагія жанчыны!
Каб сумаваць не было вам прычыны!
Каб любілі вас вашы дзеткі,
Каб расцвіталі ў садзе кветкі,
І каб здаровы былі вашы дзеткі!

*Дзеці дораць матулям свае падарункі.*

Літаратура

1. Вучэбная праграма дашкольнай адукацыі. – Мінск:Нацыянальны інстытут адукацыі, 2023.

NG ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА